— Імплементацыя Лісабонскага пагаднення, якое набыло сілу 1 снежня 2009 года, з'яўляецца адным з прыярытэтаў іспанскага прэзідэнцтва. Мы павінны зрабіць максімальна бачнымі Прэзідэнта Савета ЕС і Высокага прадстаўніка па пытаннях агульнай знешняй палітыкі і палітыкі бяспекі. Пачнуць працаваць шэраг практычных пераходных пагадненняў. Яны закліканыя забяспечыць тое, каб новы Высокі прадстаўнік хутка і эфектыўна ўзяў пад сваю апеку функцыі, якія цяпер ажыццяўляюць Еўрапейская Камісія і Прэзідэнцтва. Усе інстытуцыі ЕС і 27 дзяржаў-сябраў, а не толькі Іспанія, Венгрыя і Бельгія (гэтыя дзве краіны будуць мець старшынство ў ЕС пасля нас), цяпер сумесна над гэтым працуюць.

— Што значыць Лісабонская дамова для знешніх адносін ЕС, у прыватнасці з суседнімі з ім краінамі?

— Лісабонская дамова істотна змяняе спосаб, якім Еўрасаюз будзе ажыццяўляць сваю знешнюю палітыку. Нашыя партнёры гэта вельмі хутка заўважаць. Прадстаўніцтвы Еўракамісіі ўжо сталі Прадстаўніцтвамі Еўрасаюзу — і гэта не толькі змена шыльды. Кожнае з іх будзе паступова ажыццяўляць усё больш функцый са сферы знешніх адносін ЕС, якія раней ажыццяўляліся краінай, якая старшынствавала ў Саюзе.

— Як Вы ацэньваеце цяперашнія адносіны паміж ЕС і Беларуссю? У апошні час шмат гавораць пра пацяпленне ў іх — наколькі, на Ваш погляд, гэты працэс ўстойлівы і схільны да далейшага развіцця?

— У кастрычніку 2009 года Савет Еўрасаюзу прагаласаваў за змяненне палітыкі ЕС адносна Беларусі. Быў вызначаны шэраг сфер, дзе будзе даследавацца магчымасць сумесных з ёй дзеянняў. Глабальны эканамічны крызіс яшчэ больш узмацніў гэтую нашу рашучасць. У выніку ЕС і Беларусь цяпер сумесна праводзяць дыялог, які толькі год з нечым таму цяжка было ўявіць. І патэнцыял далейшага супрацоўніцтва вялікі.

Беларусь мяжуе з трыма краінамі-сябрамі ЕС, таму менавіта Саюз мае непасрэдную цікавасць да таго, каб уцягнуць Беларусь у канструктыўны дыялог у шматлікіх сферах. У той жа час ЕС занепакоены сітуацыяй з дэмакратыяй, ужываннем смяротнага пакарання і незадавальняльным станам выканання фундаментальных правоў чалавека. Беларусь засталася ледзь не апошняй краінай на нашым кантыненце, дзе ўжываецца смяротнае пакаранне. Мы гаворым нашым беларускім сябрам, што мы адкрытыя для адносін — у прыватнасці ў тым, што тычыцца спынення санкцый адносна афіцыйных асоб і аднаўлення працэсу ратыфікацыі Пагаднення аб партнёрстве і супрацоўніцтве. Мы прапанавалі Беларусі актыўную ролю ва Усходнім партнёрстве — ініцыятыве, якая скіравана на павышэнне дабрабыту і супрацоўніцтва ў краінах Усходняй Еўропы, што з'яўляюцца суседзямі ЕС. Аднак Беларусь павінна прыкласці намаганні, якія прывядуць да замацавання ў краіне еўрапейскіх каштоўнасцей і дадуць нам магчымасць працаваць больш цесна дзеля дабрабыту нашых грамадзян.

— Што для Вас як для пасла краіны, якая старшынствуе ў ЕС, будуць азначаць менавіта гэтыя змяненні ў адносінах ЕС і Беларусі?

— Пацяпленне паміж Беларуссю і ЕС з'яўляецца выклікам для абодвух бакоў. Мы ўсё яшчэ на ранняй стадыі развіцця нашых двухбаковых адносін, і ёсць неабходнасць стварэння для іх больш моцнага падмурка. Еўрасаюз імкнецца да поўнамаштабнага партнёрства з Беларуссю, плануе адкрыць паўнавартаснае прадстаўніцтва ў Мінску. Для мяне асабіста і для іспанскага ўрада прэзідэнцтва ў ЕС дае шанец працаваць цесна з іншымі інстытуцыямі Саюза і краінамі-сябрамі ў выпрацоўцы і імплементацыі палітыкі ЕС адносна Беларусі. Іспанія, канечне ж, вітала б паляпшэнне гэтых адносін, і ўсяляк заахвочвае Беларусь даць станоўчы сігнал у далікатных для нас сферах — напрыклад, увядзенне мараторыя на выкананне смяротных прысудаў. Са свайго боку Беларусь таксама мае вялікую цікавасць да такога партнёрства. Мэта мая і маёй краіны — скасаваць перашкоды, якія ўсё яшчэ стрымліваюць паўнавартаснае развіццё адносін паміж Беларуссю і Еўрасаюзам.

— Што мог бы даць Беларусі паўнавартасны ўдзел у ініцыятыве ЕС Усходняе партнёрства?




ЕВРОПАРЛАМЕНТ О БЕЛАРУСИ: ПРОБЛЕМЫ ОСТАЮТСЯ, НО ЕСТЬ И ПОЛОЖИТЕЛЬНЫЕ ИЗМЕНЕНИЯ



В конце 2009 года Европейский Парламент принял резолюцию по Беларуси. В ней ЕП высказал свою поддержку решению Совета Евросоюза, принятому в октябре прошлого года: продолжить санкции против некоторых официальных лиц страны, но в то же время приостановить ограничения на их поездки в ЕС до октября 2010 года («Евробюллетень» подробно рассказывал о выводах Совета ЕС в прошлом номере).

Европарламентарии заявили, что для окончательного снятия санкций Беларусь должна сделать больше в сфере свободы масмедиа, провести реформы избирательного законодательства. Также, по мнению европарламентариев, за прошлый год не было достигнуто должного прогресса в сферах прав человека и фундаментальных свобод; продолжаются репрессии против политических оппонентов, белорусские власти отказались зарегистрировать некоторые политические партии, общественные организации и медиа.

В то же время Европарламент признал, что были и положительные изменения: например, освобождение ряда политических заключенных, разрешение на распространение двух независимых газет и «конструктивное и активное участие» Беларуси в Восточном партнерстве.



— Прапанова ЕС Беларусі стаць паўнавартасным удзельнікам у рамках Усходняга партнёрства галоўным чынам скіраваная на беларускіх грамадзян. На тое, каб зрабіць іх больш заможнымі і вольнымі. Адной з глыбінных мэтаў ЕС з'яўляецца мэта падзяліць са сваімі суседзямі свабоду і росквіт, якія маюць і вельмі цэняць яго грамадзяне.

Усходняе партнёрства будуецца на ўзаемных абавязацельствах, якія тычацца шэрагу фундаментальных каштоўнасцей: дэмакратыі, выканання правоў чалавека, рынчнай эканомікі, адпаведнага кіравання... Недвухсэнсоўная прыхільнасць да гэтых каштоўнасцей з'яўляецца мэтай практычнага развіцця нашых двухбаковых адносін, пры якім беларускі народ атрымлівае ўсе тыя перавагі, якія мы, са свайго боку, яму прапануем.

Уласна кажучы, Беларусь ужо мае карысць ад свайго ўдзелу ва Усходнім партнёрстве, асабліва ў так званым шматбаковым фармаце. Беларускіх афіцыйных асоб перыядычна запрашаюць на абмеркаванне пытанняў, якія ўяўляюць агульную цікавасць для 27 краін-сябраў ЕС і пяці астатніх партнёраў. Ажыццяўляецца абмен перадавым вопытам у такіх сферах, як ахова навакольнага асяроддзя, энергаэфектыўнасць, эканамічнае супрацоўніцтва, барацьба з карупцыяй, міграцыя і інтэграванае кіраванне межамі.

— Вы зусім нядаўна ўручылі даверчыя граматы Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку. Пра што была Ваша размова з кіраўніком рэспублікі, ці закраналіся еўрапейскія пытанні?

— На самой справе мы якраз і размаўлялі пра еўрапейскія пытанні. Я імкнуўся паказаць яму перавагі і карысці, якія Беларусь мела б ад больш цесных адносін з ЕС.

— Як Вы ацэньваеце адносіны паміж Іспаніяй і Беларуссю? Наколькі выкарыстоўваецца патэнцыял гэтых адносін і што можна было б палепшыць?

— Дыпламатычныя адносіны паміж Іспаніяй і Беларуссю былі ўсталяваныя ў 1992 годзе. З тых часоў мы працуем над больш цеснымі сувязямі паміж нашымі краінамі. Гэтыя адносіны да цяперашняга часу не выкарыстоўваюць усяго свайго патэнцыялу. Але нешта пачало змяняцца. Павольна, але ўпэўнена расце двухбаковы гандаль, абодва ўрады спрыяюць гэтаму працэсу. Самае важнае цяпер — нам трэба пабудаваць прававую базу для развіцця нашых гандлёвых і фінансавых адносін. Павінны ўзрасці прамыя інвестыцыі. Гэта, канечне ж, здарыцца, як толькі будзе створана спрыяльнае эканамічнае асяроддзе.

— Летась у кастрычніку Вы ўпершыню наведалі Беларусь для ўручэння даверчых грамат. Якія ў Вас уражанні ад таго візіту?

— Тое, што я тады пабачыў, спадабалася. Мая акрэдытацыя ў Беларусі азначае, што мне давядзецца прыязджаць сюды вельмі часта і грунтоўна вывучыць краіну. Я ўпэнены, што мая цікавасць да Беларусі будзе няўхільна ўзрастаць.

СТАРТАВАЎ ПРАЕКТ «ДЗЕЦІ ЧАРНОБЫЛЯ»



Кіраўнік Прадстаўніцтва Еўрапейскага Саюзу ў Беларусі Жазэ Мануэл Пінту Тэйшэра

У БЕЛАРУСІ ПАЧАЎСЯ ФІНАНСАВАНЫ ЕЎРАСАЮЗАМ ПРАЕКТ «ДЗЕЦІ ЧАРНОБЫЛЯ». РЭАЛІЗУЮЦЬ ЯГО СУМЕСНА МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ І ДЗІЦЯЧЫ ФОНД ААН (ЮНІСЭФ).

Праект разлічаны на два гады. Кіраўнік Прадстаўніцтва Еўрапейскага Саюзу ў Беларусі Жазэ Мануэл Пінту Тэйшэра на прысвечанай яго пачатку прэс-канферэнцыі заявіў:

— Наступствы Чарнобыльскай катастрофы да сённяшняга часу ажыццяўляюць уплыў на жыццё людзей. Таму дзяржавы Еўрапейскага Саюзу ў партнёрстве з ЮНІСЭФ прыкладаюць намаганні для ўмацавання адпаведных служб, забяспечваюць дапамогу і адэкватную інфармацыю.

Па словах прадстаўніка ЮНІСЭФ у Беларусі Юрыя Аксамітнага, адна з асноўных задач праекта — паляпшэнне якасці медыцынскага абслугоўвання жанчын і дзяцей, якія пражываюць на пацярпелых у выніку катастрофы на ЧАЭС тэрыторыях.

— Асаблівая ўвага будзе надавацца пытанням павышэння кампетэнтнасці і падрыхтоўкі спецыялістаў, якія ажыццяўляюць медыцынскую дапамогу ў забруджаных раёнах, — падкрэсліў ён.

Юры Аксамітны таксама дадаў, што важным накірункам стане паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў аховы здароўя, якія бяруць удзел у праекце. У прыватнасці, для 15 такіх устаноў у Магілёўскай, Гомельскай і Брэсцкай абласцях будзе набыта абсталяванне на суму больш за 600 тыс. даляраў ЗША: інкубатары для нованароджаных, апараты штучнай вентыляцыі лёгкіх і іншае.

Падчас рэалізацыі праекта асаблівая ўвага будзе нададзена працы па фарміраванні здаровага ладу жыцця сярод моладзі, інфармаванні насельніцтва аб карыснасці ўжывання ў ежу ёдаванай солі. Таксама адной з мэтаў з'яўляецца спрыянне фарміраванню пазітыўнага і адказнага бацькоўства, накіраванага на паляпшэнне ведаў і навыкаў па даглядзе за дзіцём, камунікаванню і гульні. Акрамя таго, падчас рэалізацыі праекта «Дзеці Чарнобыля» ў Беларусі будзе адчынена пяць цэнтраў сяброўскай падтрымкі дзяцей і моладзі.

Начальнік аддзела медыцынскай дапамогі маці і дзецям Міністэрства аховы здароўя Беларусі Алена Богдан дадала, што акрамя яе ведамства і ЮНІСЭФ удзел у рэалізацыі праекта «Дзеці Чарнобыля» бяруць Беларускі дзяржаўны медыцынскі універсітэт, Беларуская медыцынская акадэмія паслядыпломнай адукацыі, РНПЦ «Маці і дзіця», упраўленне аховы здароўя Гомельскага, Магілеўскага і Брэсцкага аблвыканкамаў.

Цалкам бюджэт праекта «Дзеці Чарнобыля» складае каля мільёна даляраў. Па стане на 2 студзеня 2009 года амаль 257 тыс. дзяцей Беларусі (больш за 14% ад іх колькасці ў краіне) пражывалі на тэрыторыях, пацярпелых у выніку Чарнобыльскай катастрофы.

НАЛАДЖВАЮЦЦА ПАРЛАМЕНЦКІЯ СУВЯЗІ Ў РАМКАХ УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА



Сяргей Маскевіч

У сярэдзіне студзеня ў Брусэлі адбылося паседжанне рабочай групы ў фармаце кіраўнікоў камітэтаў па міжнародных справах і па пытаннях еўрапейскай інтэграцыі нацыянальных парламентаў краін-сябраў ЕС і Усходняга партнёрства.

Ад Нацыянальнага сходу Беларусі ўдзел у спатканні прымалі старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД Сяргей Маскевіч і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Ніна Мазай.

— Удзельнікі паседжання ўзгаднілі пытанні фарміравання такой пастаяннай структуры, якая будзе забяспечваць узаемадзеянне нацыянальных парламентаў Еўрасаюзу і шасці усходнееўрапейскіх краін, — распавёў Сяргей Маскевіч у інтэрв'ю БЕЛТА. Па яго словах, новая структура будзе працаваць разам з канферэнцыяй старшынь парламенцкіх камітэтаў па міжнародных справах краін Еўрасаюзу.

Сяргей Маскевіч адзначыў, што дакумент, які апісвае канцэпцыю і форму гэтай структуры, у бліжэйшы час будзе прадстаўлены нацыянальным парламентам Еўрасаюзу і краін-партнёраў, а таксама вынесены на саміт спікераў парламентаў ЕС. Ён патлумачыў, што ўдзельнікі рабочай сустрэчы прынялі рашэнне «пакуль не абмяркоўваць пытанні ўзаемадзеяння Еўрапарламента з усходнееўрапейскімі краінамі».

— Яны будуць разгледжаны асобна пры фарміраванні парламенцкай асамблеі Усходняга партнёрства Еўранэст — пасля таго, як Еўрапарламент падрыхтуе свае канчатковыя прапановы адносна гэтага, — дадаў Сяргей Маскевіч.

БАРАЦЬБА СА ЗМЯНЕННЕМ КЛІМАТУ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

ЛЕТАСЬ У СНЕЖНІ Ў КАПЕНГАГЕНЕ АДБЫЛАСЯ МІЖНАРОДНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ПА СУПРАЦЬДЗЕЯННІ ЗМЯНЕННЯМ КЛІМАТУ. НА ЖАЛЬ, ЯНА НЕ СПРАЎДЗІЛА НАДЗЕЯЎ ЕЎРАСАЮЗУ, ЯКІ ВЫСТУПАЎ ЗА ПАДПІСАННЕ ЮРЫДЫЧНА АБАВЯЗКОВАГА МІЖНАРОДНАГА ПАГАДНЕННЯ, ДЗЯКУЮЧЫ ЯКОМУ СВЕТ СКАРАЦІЎ БЫ ВЫКІДЫ ПАРНІКОВЫХ ГАЗАЎ.

У той жа час на працягу ўсяго леташняга году і падчас самой Капенгагенскай канферэнцыі ЕС праводзіў вялікую агітацыйную і адукацыйную працу, закліканую ўзняць усведамленне чалавецтвам небяспекі, якую хавае ў сабе глабальнае пацяпленне. Так, у сярэдзіне снежня ў рамках праекта ЕС і ПРААН «Пабудова патэнцыялу ў вобласці стратэгічнай экалагічнай ацэнкі і рэалізацыі прыродаахоўных канвенцый» сумесна з мінскай экалагічнай гімназіяй № 19 адбылася «жывая» акцыя «Клімат змяняецца. А ты?».





У рамках акцыі ў гімназіі быў праведзены конкурс дзіцячых малюнкаў, плакатаў, коміксаў, улётак на тэму зніжэння выкідаў планетай парніковых газаў. Таксама было паказана тэатралізаванае дзіцячае прадстаўленне ў касцюмах, зробленых з бытавых адпадаў і прыроднага матэрыялу. Вучні гімназіі № 19 шмат увагі надаюць пытанням змянення клімату, удзельнічаюць у шматлікіх экалагічных праектах на тэму зніжэння «вугляроднага следу», устойлівага развіцця энергазахавання. У рамках акцыі дзеці прадставілі свае праекты «Дамо адпадам другі шанец», «Экалагічны след», «Экалагічны выбар», брашуру «Чаму клімат цяплее?». А эксперты праекта «Пабудова патэнцыялу ў вобласці стратэгічнай экалагічнай ацэнкі і рэалізацыі прыродаахоўных канвенцый» на практыцы прадэманстравалі працу свайго «дынамічнага» буклета, які дазваляе разлічыць персанальны «вугляродны след», і далі рэкамендацыі па яго зніжэнні. Пераможцы дзіцячых конкурсаў і ўдзельнікі экалагічных праектаў былі ўзнагароджаны прызамі.

Што ж, супрацьдзеянне змяненню клімату — гэта не толькі міжнародныя канферэнцыі, але і такія вось акцыі, якія ўносяць сваю лепту ў глабальны працэс. Канечне ж, яны будуць працягвацца і ў 2010 годзе. Прынамсі Еўрасаюз змяншаць сваю актыўнасць ў кліматычных справах не збіраецца.

ПРОГРАММА ЭРАЗМУС-МУНДУС ПРИНИМАЕТ ЗАЯВКИ НА РЕАЛИЗАЦИЮ ПРОЕКТОВ

Образовательная программа Европейского Союза Эразмус-Мундус проводит прием заявок на реализацию проектов в ее рамках. Последний срок подачи — 30 апреля 2010 года. Подробную информацию можно получить на сайте **http://ec.europa.eu/education/external-relation-programmes/doc72_en.htm.**

Программа Эразмус-Мундус действует с 2006 года. Она поддерживает создание партнерских консорциумов между высшими учебными заведениями Европы и третьих стран. Их целью является обеспечение индивидуальной мобильности студентов (бакалаврского, магистерского, докторского и постдокторского уровней), исследователей и академического персонала между образовательными институциями ЕС и третьих стран. Также в рамках программы предоставляются гранты ученым и студентам из третьих стран для обучения в университетах ЕС (интервью с одним из белорусских стипендиатов Эразмус-Мундус читайте на стр. 14). Программа поддерживает межуниверситетское сотрудничество и поощряет поездки европейских студентов и ученых в университеты третьих стран.



«ПРЫНАЛЕЖНАСЦЬ ДА ІНШАЙ КУЛЬТУРЫ НЕ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ВЫЗНАЧАЛЬНАЙ ДЛЯ СТАСУНКАЎ У ЕЎРОПЕ»

ВЫПУСКНІК БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА АЛЕГ СІДАРЭНКА Ў ЦЯПЕРАШНІ ЧАС З'ЯЎЛЯЕЦЦА СТЫПЕНДЫЯТАМ ПРАГРАМЫ ЕС «ЭРАЗМУС МУНДУС». ЁН НАВУЧАЕЦЦА Ў КАТАЛІЦКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ ЛУВАНА (БЕЛЬГІЯ), ДРУГІ СЕМЕСТР ПРАВЯДЗЕ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ ВУПЕРТАЛЯ (ГЕРМАНІЯ). АЛЕГ ПАДЗЯЛІЎСЯ З «ЕЎРАБЮЛЕТЭНЕМ» НЕКАТОРЫМІ ЎРАЖАННЯМІ АД НАВУЧАННЯ Ў ЕЎРОПЕ.

— Наколькі вялікай з'яўляецца розніца паміж навучаннем ва універсітэце і студэнцкім жыццём у Беларусі і Бельгіі?

— Навучанне на этапе магістратуры ў Бельгіі мяркуе пэўную ступень самастойнасці. Гэта выяўляецца ў магчымасці самастойна планаваць свой вучэбны працэс: да прыкладу, выбіраць курсы адпаведна інтарэсам. Гэта, між іншым, матывуе выкладчыкаў рабіць іх «прадукт» максімальна канкурэнтным. Такая самастойнасць, на мой погляд, цесным чынам звязаная таксама з наяўнасцю вольнага часу ў студэнта ў бельгійскім і — лічу, будзе дарэчным абагульніць — еўрапейскім універсітэце. У нас ва універсітэце вісіць плакат — «Сімвал самастойнасці — 0% плагіяту».

Што тычыцца Беларусі, то даволі часта даводзілася быць сведкам скаргаў выкладчыкаў на агромністыя вучэбныя нагрузкі, адсутнасць часу. Гэта, безумоўна, уплывае на ўзровень чытаных курсаў. Тое ж меркаванне можна ўжыць і ў дачыненні да беларускага студэнта. Празмерна вялікі набор курсаў у кожным семестры пры абавязковым іх наведванні, якое рэгулярна адсочваецца з боку адміністрацыі універсітэта — ўсё гэта робіць размытым уяўленне пра плагіят і аўтарства. Пры гэтым я не хачу прыменшыць інтэлектуальныя здольнасці беларускага студэнта ў параўнанні з яго бельгійскім калегам. Але магчымасці студэнта ў бельгійскім універсітэце вышэй. У маім, напрыклад, ёсць архіў французскага фенаменолага Мішэля Анры. Таму дзеля сваіх даследаванняў сюды прыязджае вялікая колькасць дактарантаў, постдактарантаў з розных краін Еўропы. Гэта яшчэ адно адрозненне. Палова аўдыторыі ў Луванскім універсітэце — прыезжыя. Гэта азначае, што мабільнасць студэнтаў еўрапейскага універсітэта даволі вялікая ў параўнані ў мабільнасцю беларускіх студэнтаў.

— Ці дапасаваліся Вы ўжо да жыцця ў Бельгіі, што было і застаецца самым цяжкім у адаптацыі да вучобы і быту?

— Першы час быў пэўны моўны бар'ер, таму што раней не даводзілася знаходзіцца працяглы час у франкамоўнай краіне. Усё ж паўсядзённая французская мова трошкі адрозніваецца ад школьнай і універсітэцкай, якую я вывучаў у Беларусі. Датычна адаптацыі да быту, то я імкнуўся і ў перыяд свайго студэнцтва ў Беларусі карыстаць з усіх магчымасцей для падарожжаў, таму асаблівых бытавых складанасцяў пры змяненні месца побыту не адчуваю. Наадварот, сам працэс харчавання, адкрыцця іншых культурных правілаў прываблівае. Ён дазваляе, у выніку, ідэнтыфікаваць свой культурны гарызонт. Але, бадай, ёсць адзін момант у Бельгіі, які напачатку выклікаў у мяне пэўны дыскамфорт. Гэта традыцыя вітаць пры сустрэчы асоб мужчынскага полу пацалункамі.

— Чым Вашы еўрапейскія аднагодкі адрозніваюцца ад беларускай моладзі?

— З-за пэўных гістарычных абставінаў еўрапейская студэнцкая моладзь у большай ступені кансалідаваная. Больш «выхаваная» альбо арыентаваная на змаганне за свае інтарэсы ў публічнай прасторы, і ў гэтым сэнсе на тое, каб браць на сябе пэўную долю адказнасці. Гэта значыць універсітэт — гэта сапраўды свайго роду карпарацыя, дзе яе сябры адчуваюць сваю прыналежнасць да яе. Студэнты, напрыклад, рэгулярна арганізуюць маніфестацыі з патрабаваннямі змяншэння платы за навучанне і павелічэнне аб'ёмаў будаўніцтва студэнцкага жылля. Цікава, што самі бельгійскія студэнты аб'ядноўваюцца ў суполкі, якія прадстаўляюць іх родныя гарады: ладзяць вечарыны той ці іншый правінцыі і прапануюць пазнаёміцца з яе адметнасцю шляхам дэгуставання мясцовага піва.

— Ці бачыце Вы адрозненне паміж еўрапейскай моладдзю і беларускай у тым, што тычыцца стыля харчавання і адзення, спорту, музыкі і г.д.?

— Канечне, пэўныя адрозненні ёсць. У Луване, напрыклад, мноства папулярных спартыўных комплексаў, у рамках якіх прапануюцца каля 60 розных відаў спорту. Што тычыцца адзення, то тут хутчэй дамінуе прынцып камфортнасці: яно не мае асаблівага сімвалічнага напаўнення, вельмі прыступнае. Адпаведна, няма і строгіх, яўных ці няяўных, правілаў стылю. Неаднакроць назіраў, напрыклад, з'яўленне сваіх выкладчыкаў па філасофіі, далёкіх ад дысцыпліны па фізічнай культуры, тым не менш апранутых хутчэй для актыўнага ўдзелу ў спартыўных спаборніцтвах. У Беларусі ўсё ж гэтаму надаецца пэўнае значэнне: добра выглядаць азначае, у тым ліку, і пэўны, не нізкі, узровень выдаткаў на гардэроб. Што тычыцца харчавання, то ў Луване нават у параўнані з Мінскам больш развітая сістэма фаст-фуда. Ён паўсюль. Таму і больш папулярны, чым у нас.

— Вы прадстаўляеце краіну Усходняй Еўропы, якая для шмат каго з заходнееўрапейцаў з'яўляецца ў значнай ступені невядомай. Гэта ўплывае на стасункі?

— Безумоўна, уяўленні пра Беларусь у мясцовай моладзі вельмі бледныя. Часцей за ўсё звязаныя з прапанаваным медыйным вобразам, які ў большай ступені негатыўны. Пры гэтым шмат хто дзівіцца з таго факту, што палёт да Мінска займае толькі некалькі гадзін. Відавочна, у іх уяўленні Беларусь знаходзіцца шмат далей, магчыма, у іншым свеце. А ўвогуле, і бельгійскае грамадства, і еўрапейскае ў цэлым з'яўляюцца мультыкультурнымі. Таму сам фактар прыналежнасці да іншай культуры ўжо не з'яўляецца вызначальным для стасункаў.



1 января 2010 года. У Президента Европейского Совета Германа Ван Ромпея первый официальный рабочий день в новой должности.



Три миллиона евро неотложной помощи выделил Европейский Союз пострадавшей от небывалого землетрясения Гаити. Была практически сметена с лица земли столица — Порт-о-Пренса. Сотни тысяч людей погибли. Президент Еврокомиссии Жозе Мануэль Баррроззу выразил глубочайшее сочувствие пострадавшим от стихии. Он заверил, что Европа не оставит Гаити без помощи. Общий объем помощи, который ЕС предоставит Гаити, составит более 400 млн евро.



Немецкий Эссен вместе со Стамбулом и венгерским городом Печ являются Европейскими столицами культуры — 2010. 9 января в Эссене состоялись посвященные этому торжественные мероприятия, помешать которым не смогла погода. На фото в центре: Президент Еврокомиссии Жозе Мануэль Баррозу во время праздничного концерта.



12 января к Президенту Европарламента Ежи Бузеку по случаю праздника Трех королей пришли вот такие гости. Евангелие от Матфея рассказывает, что младенцу Христу в Вифлееме пришли поклониться пастухи и мудрецы с Востока. Число их в Библии не указано, но по количеству даров богословы заключили, что мудрецов (или волхвов) было трое. Позже они были переименованы в королей: Балтасар, Мельхиор и Каспар. День памяти Трёх королей отмечают «воспеванием звезды»: дети в бумажных коронах под символом Вифлеемской звезды поют и собирают деньги на нужды детей в бедных странах.



Европу в январе завалило снегом. Застрявшие в снеговых сугробах автомобили, отмененные авиарейсы... Ну и невозможность ездить на таких любимых европейцами велосипедах.



Замок Боссенштейн



Город Гент



Манекен пис (писающий мальчик) — символ бельгийской столицы

Городами и странами ЕС

Бельгия

Королевство Бельгия является одним из государств-основателей Европейского Союза. Член зоны евро и Шенгенского визового пространства.

Бельгия расположена в Западной Европе. Граничит с Нидерландами, Германией, Люксембургом и Францией. Омывается Северным морем.

Население Бельгии — около 10,3 млн человек. Страна является одной из самых густонаселенных в мире. Население состоит из двух примерно равных по численности этнических групп: фламандцев, говорящих на нидерландском (фламандском) языке, и франкоязычных валлонов.

Бельгия — конституционная монархия. Формально главой государства является король, фактически — премьер-министр. Обычно им становится представитель партии, победившей на парламентских выборах. Конституция Бельгии требует языкового паритета в правительстве: половина министров должна представлять фламандскоязычное население, половина — франкоязычное.

Столица Бельгии — Брюссель — является также негласной столицей Европейского Союза. В нем расположены главные его институции: Совет ЕС, Еврокомиссия и Европарламент. Также в Брюсселе располагается штаб-квартира НАТО и некоторые другие международные структуры.



Гран пляс — центральная площадь Брюсселя



Здание Европейской Комиссии